***Жыццё і творчасць Уладзіміра Арлова***

Празаік, паэт і эсэіст Уладзімір Арлоў – бадай самы знакаміты сучасны пісьменнік свайго пакалення. У сучаснага чытача асаблівай папулярнасцю цешацца ягоныя творы гістарычнага жанру, у якіх аўтар, гісторык па адукацыі, працягвае і пераўвасабляе традыцыі У. Караткевіча.

Нарадзіўся Уладзімір Арлоў 25 жніўня 1953 года ў Полацку. У 1975 годзе скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пасля заканчэння ўніверсітэта працаваў настаўнікам, карэспандэнтам, рэдактарам у выдавецтве “Мастацкая літаратура”. Уладзімір Арлоў з’яўляецца сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў і Беларускага ПЭН-цэнтра.

Першыя вершы апублікаваў у 1973 годзе ў студэнцкім самавыдавецкім часопісе „Блакітны ліхтар”. Пазней друкаваўся ў зборніку „Мілавіца”. Пісьменнік выдаў вялікую колькасць кніг прозы, між іншым *Добры дзень, мая Шыпшына. Апавяданні, аповесць* (1986), *Дзень, калі ўпала страла. Аповесці і апавяданні* (1988), *Ордэн Белай Мышы. Аповесці. Апавяданні* (2003, 2013), *Час чумы. Гістарычныя аповесці. Апавяданні* (2005) і інш. На яго творчым рахунку таксама зборнікі артыкулаў і эсэ *„Совершенно секретно”, альбо Адзін у трох іпастасях. Літаратурна-публіцыстычныя артыкулы. Эсэ* (1992), *Адкусі галаву вароне. Эсэ* (2003), *Каханак яе вялікасці. Гістарычныя апавяданні. Эсэ* (2004) і інш., а таксама зборнікі вершаў *Паром праз Ля-Манш. Вершы* (2006), *Усё па-ранейшаму, толькі імёны змяніліся. Вершы* (2009) і інш. Вялікая колькасць апавяданняў У. Арлова выйшла ў форме аўдыёкніг Шматлікія творы пісьменніка перайшлі межы ўнутранага кніжнага рынку і  былі выдадзеныя ў перакладах на англійскую, нямецкую, польскую, шведскую, чэшскую, украінскую, венгерскую, французскую, румынскую, рускую,  эстонскую, літоўскую, латышскую, славацкую, грузінскую і іншыя мовы.

У сваіх гістарычных творах аўтар пераносіць чытача ў розныя эпохі, знаёміць з палітычнымі і культурнымі дзеячамі, асветнікамі і рэвалюцыянерамі. Творы Арлова праз прызму мінулага дапамагаюць ацаніць грамадскія працэсы сённяшняга дня.

У пазнейшы перыяд сваёй творчасці У. Арлоў раскрываецца перад намі як арыгінальны эсэіст. Ягонае эсэ „Незалежнасць – гэта...” не страціла актуальнасці і сёння. Напісаны ў 1990 годзе тэкст быў перакладзены на больш за 25 моў.

Талент Уладзіміра Арлова выяўляецца таксама на ніве аўтара-сцэнарыста. З-пад яго пяра выйшлі сцэнарыі для навукова-дакументальных фільмаў „Еўфрасіння Полацкая”, „Полацкія лабірынты”, „Сімяон Полацкі” і інш. У сваёй творчай дзейнасці займаўся таксама перакладамі. Пераклаў з рускай мовы  кнігу Мікалая Улашчыка *Была такая вёска* (1989), з украінскай мовы  кнігі Валерыя Шаўчука *Забойства Пятра Невядомага* (1993),

Аляксандра Ірванца *Роўна / Ровно* (2007).

У 2022 годзе Уладзімір Арлоў быў вымушаны эміграваць. Цяпер жыве і працуе ў Польшчы.

Для больш поўнага знаёмства з жыццём і творчасцю Уладзіміра Арлова рэкамендуем пазнаёміцца з наступнымі пазіцыямі:

- Афіцыйны сайт Уладзіміра Арлова: arlou.by
- А. Дарагакупец, (2004) *Традыцыі інтэлектуальнага гістарычнага рамана ў творчасці Уладзіміра Арлова* [у:] *Веснік ДБУ*, Сер. 4. №2. 2004 [online] elib.bsu.by/bitstream/123456789/210205/1/12-17.pdf
- N. Panasiuk, (2009) *Нацыянальная ідэя ў творчасці Уладзіміра Арлова* [у:] *Acta Albaruthenica* 9/2009, Warszawa, s. 144–151.
- Тэлеперадача з Уладзімірам Арловым: www.youtube.com/watch?v=bDS7R99jj4k
- Дз. Клябанаў, (2018) *Рэканструкцыя, канструкцыя і стылізацыя як элементы пісьменніцкай стратэгіі Уладзіміра Арлова* [у:] *Беларуская гістарычна літаратура: жанры, характары, праблемы. Да 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 22–23 сакавіка 2018 г.)*. Мінск, s. 221–228.